# Стаўленне беларускай шляхты XVI–XVII стагоддзяў да жыцця і смерці згодна з іх тэстаментамі

**Стахно Ніна Валер’еўна,**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Даклад прысвечаны праблеме каштоўнасцяў беларускай шляхты ў святле смерці. З дапамогай аналіза тэстаментаў мы высветлілі стаўленне раннемадэрновага беларускага шляхціца да смерці, акрэслілі ўяўленні аб замагільным жыцці, а таксама вызначылі яго жыццёвыя прыярытэты і сямейныя ўзаемаадносіны адносіны.*

Самыя важныя моманты чалавечага жыцця можна акрэсліць пры святле смерці. Менавіта рэфлекія над гэтым складаным пытаннем дае адказ на тое, што было вартым увагі чалавека. Нажаль, такога кшталту дакументы асабістага паходжання як дзённікі і ўспаміны не былі папулярны ў нашых продкаў у XVI–XVII ст., таму паглядзець на жыццё тагачасных людзей праз прызму смерці мы можам толькі з дапамогай тэстаментаў, якія, дарэчы, былі вельмі шырока распаўсюджаны.

Тэстаменты, як юрыдычныя акты апошняй волі чалавека, безумоўна, маюць свой акрэслены і замацаваны ў прававой традыцыі фармуляр. Па гэтай прычыне, некаторыя абароты паўтараюцца ў вялікай колькасці дакументаў і не дазваляць нам сцвярджаць, што гэта праявы асабістых думак чалавека. Так, напрыклад, у самым пачатку, у інвакацыі, знаходзіцца ўсхваленне Бога і выказваецца стаўленне тэстатара да смерці. У беларускай шляхты мы знаходзім пакорлівасць перад воляй Госпада Бога, спадзяванне на яго міласэрнасць і адсутнасць страху перад смерцю. Што тычыцца адносінаў да смерці, то тут назіраюцца матывы танца смерці, непазбежнасці скону, роўнасці ўсіх перад тварам смерці. У тэстаментах прысутнічаюць наступныя выказванні: тое што нарадзілася – павінна памерці; смерць рашэнне зробленае Богам, таму яе неабходна ўспрымаць з падзякай; “живо родиться, то умерети мусить”; “не есть жадная реч певнейшая, яко смерть”; “над смерть нет ничего певнейшого”, “чуйте, бо не ведаете часу и годины пристья смерти” і г.д [1, с. 541; 2, с. 51, 71, 135]. Мы, з вялікай доляй упэўненасці, можам сказаць, што адсутнасць страху перад смерцю і пакорлівасць яе ўспрыняцця не была характэрна для тагачаснага чалавека, людзі баяліся паміраць, яны не жадалі пакідаць родных і ўсе свае зямныя набыткі. Такога кшталту абароты былі замацаваны царквой, якая прапагандавала пазітыўнае стаўленне да смерці і пагарду да ўсіх зямных даброт.

Такім чынам, вызначыць стаўленне чалавека да смерці з дапамогай тэстаментаў не прадстаўляецца мажлівым. Але, вызначыць што было важным для чалавека перад сыходам у іншы свет, як раз можна. Пачнем з хваляванняў чалавека аб лёсе яго душы пасля смерці.

Асновай дапамогі душы памерлага быў памін. Ён павінен быў ажыццяўляцца як непасрэдна роднымі, так і праз царкву. Грошы за памінальныя імшы звычайна перадаваліся цэрквам у якіх былі пахаваны тэстатары. Найбольш заможныя прасілі праводзіць службы ў некалькіх цэрквах. Лічылася, чым большай была колькасць набажэнстваў, тым большую дапамогу яны павінны аказаць душы нябожчыка. Акрамя таго, шляхта часта наказвала ўпісаць іх імёны ў кнігі нябожчыкаў, якія вяліся пры цэрквах і манастырах. Напрыклад, кіеўскі мешчанін Сенька Грыдкавіч завяшчаў запісаць у кнігу нябожчыкаў сябе, сваіх бацькоў, сваякоў і дзеда [3, с. 12].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Выказваліся пажаданні быць запісаным ў некалькі кніг, напрыклад так папарасіў зрабіць меўшчанін Фёдар Дарафеевіч [4, с. 527]. Даволі шырокае распаўсюджанне мела ялмужна – дапамога сіратам, хворым, убогім, а таксама перадача грошаў на фундацыю і ўтрыманне шпіталёў, для захавання ў памяці вялікай колькасці людзей імя памерлага.

Аб самой цырымоніі пахавання шляхта пісала мала. У асноўнай сваёй масе шляхцічы проста прасілі пахаваць іх «водлуг звычаю шляхетского», вельмі рэдка ўдакладняючы гэта жаданнем сціплай цырымоніі, у прысутнасці родных, святароў і жабракоў (але на справе гэтыя пажаданні амаль ніколі не выконваліся, бо пахавальныя цырымоніі выкарыстоўваліся для дэманстрацыі статуса рода і яго заможнасці).

Што тычыцца зямных справаў, то з дапамогай тэстаментаў мы можам зазірнуць у свет міжасабовых адносінаў у шляхецкай сям'і. У Рэчы Паспалітай не было строгіх забаронаў звязаных з размеркаваннем маёмасці сярод спадчыннікаў – імі маглі стаць дзеці (любога полу), жонкі, мужы, браты або сёстры. Асноўнымі абмежаваннямі былі права вена (права жонкі на трэцюю частку маёмасці мужа) і традыцыя, згодна з якой жонкам маёмасць перадавалася ў пажыццёвае карыстанне, у той час як мужам і дзецям яе аддавалі ў вечнае валоданне, але зразумела, што перавага ў шэрагу спадкаемцаў належыла ў першую чаргу сынам. Такім чынам, каму даставалася болей за ўсё, да таго і стаўлене было лепшым. Пабачыць адносіны ў сям'і можна не толькі праз размеркаванне маёмасці, але і зыходзячы са зваротаў да розных членаў сям'і (маглі вельмі пяшчотна адклікацца пра сваіх сужэнцаў, з вялікай любоўю апісваць сумеснае жыццё) [5, с. 101]. Калі дзеці тэстатара былі яшчэ маленькімі, то пакідаліся наказы з нагоды іх навучання і далейшага жыццёвага шляху, даваліся настаўленні і парады. Дзяўчатам наказвалася браць прыклад з набожнай і пакорлівай маці, атрымаць хатнюю адукацыю і выйсці замуж (часамі агаворваліся і кандыдаты на ролю мужа) ці ісці ў манастыр і прысвяціць сваё жыццё служэнню Богу. У наказе для сыноў асаблівая ўвага надавалася адукацыі, часам за межамі Рэчы Паспалітай, пасля якой вельмі пазітыўнай лічылася «стажыроўка» пры двары магната і далейшае служэнне Айчыне і праслаўленне шляхотнага роду. Важным момантам у настаўленні дзецям было патрабаванне любові да маці і паслухмянасці ёй. Дрэнныя адносіны з дзецьмі маглі стаць прычынай пазбаўлення спадчыны [5, с. 105].

Такім чынам, мы можам зрабіць наступныя высновы. Па-першае, нягледзячы на тое, што вялікая колькасць тэстаментаў утрымлівае пазітыўнае стаўленне да смерці, мы не можам казаць, што гэта было сапраўды так, бо тэстамент – фармалізаваны дакумент, які носіць на сабе адбітак прававой і царкоўнай культуры (праявай якой і з'яўляюцца выказванні ў дачыненні да смерці). Па-другое, тэстамент дае нам даволі шмат інфармацыі аб уяўленнях пра замагільнае жыццё і значнасць паміну душы для змяншэння пакутаў пасля смерці. Па-трэцяе, праз тэстаменты мы можам акрэсліць галоўныя пазітыўнымі вартасці чалавека, такія як любоў да Бога, павага да сваіх бацькоў, адукаванасць, працавітасць, імкненне да ўсхвалення свойго роду. Асаблівасцю тэстаментаў беларускай шляхты была перадача грошай на будаўніцтва і падтрыманне школ, калегіумаў і бальніц [1, с. 587], што спрыяла развіццю адукацыі і медыцыны. І апошняе, гэта адносіны як паміж сужэнцамі, бацькамі і дзецьмі, так і з далёкімі родзічамі і сябрамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура


1. Акты, издаваемые Комиссией, высочайше учрежденной для разбора древних актов в Вильне : в 39 т. – Т. 12. : Акты литовского главного трибунала / Я.Ф. Головацкий. – Вильна : Тип. А.Г. Сыркина, 1883. – 754 с.
2. Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. : (з актавых кніг Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / Дэпартамент па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2012. – 670 с.
3. Архив Юго-Западной России, издаваемый временной комиссией для разбора древних актов, высочайше учрежденной при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе : в 8 ч. – Ч. 1, т. 6. : Акты о церковно-религиозных отношениях в Юго-западной Руси (1322–1648) / под. ред. М.Юзефовича. – Киев : Тип. Г.Т. Корчак-Новицкого, 1883. – 941 с.
4. Акты, издаваемые Комиссией, высочайше учрежденной для разбора древних актов в Вильне : в 39 т. – Т. 9. : Акты Виленского земского суда / Я.Ф. Головацкий. – Вильна : Тип. А.Г. Сыркина, 1878. – 670 с.
5. *Сліж, Н.* Шляхецкія тэстаменты XVI – пачатку XVIII ст. / Н. Сліж, М. Гардзееў // Гістарычны альманах. – Т. 3. – Гародня, 2000. – С. 90–110.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова